**І. В. Поўх**
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## КАМПАРАТЫЎНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ СЛАВЯНСКАГА, ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАГА І АМЕРЫКАНСКАГА НАРАТЫЎНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ЗАМЕЖНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫЦЫ*

Цікавасць да кампаратыўнага даследавання варыятыўных казачных сюжэтаў, метафар і сімвалаў у кантэксце розных культур узнікае ў заходнееўрапейскай і амерыканскай фалькларыстыцы напрыканцы XIX – у пачатку XX ст. У 1903 г. у Бостане (ЗША) выходзіць зборнік рускіх, чэшскіх і венгерскіх міфаў і народных казак, складзены этнографам, фалькларыстам і перакладчыкам І. Курцінам (*Jeremiah Curtin*). У прадмове да выдання даследчык адзначае наяўнасць у гэтым празаічным фальклоры розных народаў т. зв. “першасных” (*elemental*) вобразаў як тыпалагічнае падабенства славянскай і амерыканскай міфалогіі, прыводзячы ў якасці прыкладу першавобразы Ворана, Віхуры і Паўднёвага ветру. На працягу XX ст. вывучаюцца і перакладаюцца на англійскую мову працы рускамоўных фалькларыстаў. Так, ва ўводзінах да першага англамоўнага выдання манаграфіі У. Пропа “Марфалогія казкі” (1958) амерыканская даследчыца фальклору, перакладчыца і выкладчык славянскіх моў С. Піркава-Якабсан (*Svatava Pirkova-Jakobson*) падкрэслівае, што з пункту гледжання складанасці структуры і формы казкі славянскіх народаў не маюць аналагаў ні ў Заходняй Еўропе, ні ва ўсходніх краінах. Вынікам вывучэння славянскай міфалогіі амерыканскімі фалькларыстамі XX ст. стала выданне ў 1998 г. “Энцыклапедыі рускіх і славянскіх міфаў і паданняў”, у прадмове да якой укладальнік М. Дыксан-Кенэдзі (*Mike Dixon-Kennedy*) уводзіць славянскую міфалогію ў кантэкст еўрапейскай, праводзячы, напрыклад, паралель паміж вобразамі караля Артура і сербскага прынца Марка, заснаваную на наяўнасці адзінага правобраза – героя асецінскага эпасу Батрадза, і аналізуючы гістарычныя вытокі іх падабенства. Вывучэнню славянскай, у першую чаргу рускай, міфалогіі прысвечаны шэраг прац Э. Уорнер (*Elizabeth Warner*), ганаровага прафесара Дарэмскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія), у т. л. манаграфічнае даследаванне “Рускія міфы” (2002), у якім, апроч іншага, прасочваецца эвалюцыя асноўных тэм і матываў рускіх міфаў у кантэксце сусветнай міфалогіі. Кампаратыўныя даследаванні славянскай і грэка-рымскай міфалогіі праводзяць румынскія навукоўцы. У артыкуле М. Драгне (*Mihai Dragnea*) “Славянская і грэка-рымская міфалогія, параўнальная міфалогія” прааналізаваны асноўныя

* Праца выканана пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў у межах задання “Беларуская фалькларыстыка ў сучасным свеце: метадалагічны, праблемна-тэматычны дыяпазон, тэарэтычныя навацыі”; нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20201112 ад 26.06.2020.

падабенствы грэка-рымскага і славянскага пантэону дахрысціянскага перыяду на аснове этымалагічнага аналізу міфаў, наяўных апісанняў багоў, а таксама рытуалаў і ахвярапрынашэнняў.

К содержанию